Пасля знікнення Рэчы Паспалітай з палітычнай карты Еўропы Слонім не адчуў на сабе значных эканамічных наступстваў падзелаў і працягваў развівацца дзякуючы тром вялікім трактам — віленскаму, мінскаму і брэсцкаму, якія праходзілі праз горад. У горадзе існавала 58 магазінаў па продажы спіртных напояў, 26 бровараў па іх вытворчасці, 25 з якіх належалі габрэям. Штогод яны выраблялі 4 057 вёдзер гарэлкі. Такія вялікія аб`ёмы, пры колькасці насельніцтва на 1810 год у 2 740 чалавек, тлумачацца моцным гандлёвым рухам, які праходзіў праз Слонім.

Кожны тыдзень адбываліся базары, а кожны год на Ушэсце адбываўся вялікі кірмаш, на які прыязджалі гандляры і сяляне з усіх ваколічных мястэчак і вёсак для куплі і продажу коней, буйной рагатай жывёлы і рамесных вырабаў.

Вайна 1812 года стала чарговай трагічнай старонкай у жыцці Слоніма і яе габрэйскай абшчыны. Французскія войскі на чале з Шварцэнбергам адразу пасля заняцця горада ўсклалі на яго кантрыбуцыю ў памеры 1 000 чырвонцаў. Цяжкім наступствам акупацыі сталася зменшэнне колькасці насельніцтва, якое не магло яшчэ доўга аднавіцца пасля вайны і ў 1817 годзе складала толькі 2 400 чалавек.

У XIX ст. Слонім атрымаў вядомасць дзякуючы дзейнасці рабе Аўраама бен Іцхак Вейнберга, дзякуючы якому Слонімская іешыва дасягнула значнага ўплыву сярод традыцыйнага габрэйства. На сярэдзіну XIX ст. тут налічвалася 7 сінагог і 14 малітоўных дамоў.

Габрэі займалі вядучыя пазіцыі ў эканоміцы горада. Яны становяцца заснавальнікамі першых мясцовых фабрык. Так, Абраму Каменамосцкаму належала фабрыка па вырабе тканіны і поўсці.


У час паўстання 1830-1831 гадоў многія прадстаўнікі слонімскай моладзі падаліся ў шэрагі паўстанцаў. Настрой у горадзе быў настолькі небяспечны, што расійскі генерал Станкевіч запрасіў да сябе прадстаўнікоў кагалу і паставіў ім ультыматум: пастаўляць дадзеныя аб тых, хто ідзе да паўстанцаў або збіраецца гэта зрабіць, у адваротным выпадку Слонім будзе спалены. Да цяжкіх эканамічных наступстваў ад пастою расійскіх войск, размешчаных у асноўным у габрэйскіх хатах, рэквізіцый, рэкрутчыны, дадалася эпідэмія халеры: у 1831 годзе ў горадзе было зарэгістравана 146 выпадкаў, з якіх 86 са смяротным зыходам.

У сярэдзіне XIX стагоддзя назіраецца хуткі рост Слоніма, у якім у 1846 годзе было 6 403 жыхары (4 983 габрэі, 787 каталікоў, 374 праваслаўныя, 170 мусульман, 89 лютэран). А праз дзесяцігоддзе, у 1857 годзе, налічвалася ўжо 9 523 чалавекі.

Эканамічнае становішча большасці слонімцаў грунтавалася на дробным гандлі з ваколічным сялянствам. Толькі 5% гараджан жылі за кошт сельскай гаспадаркі, а 11% — за кошт працы на 12 невялікіх прадпрыемствах. Буйнейшым сярод іх з`яўлялася былая суконная фабрыка Навасільцава, арганізаваная ў 1820 годзе і закрытая ў 1850-м, але ў 1853-м выкупленая габрэйскімі прадпрымальнікамі Блакштэйнам і Куселем Куніцам, дзякуючы апошняму з іх у Слоніме быў пракладзены водаправод.

Васіль ГЕРАСІМЧЫК

Працяг будзе



Ташліх (скормліванне грахоў рыбам) на беразе Шчары



ГОТОВИМ ДЕТЯМ



МОРКОВНО-ТВОРОЖНЫЙ ПИРОГ

Ингредиенты:
яйца сырые — 3 штуки
морковка средняя — 1 штука
сахар — 3 ст. ложки
йогурт 0% — 3 ст. ложки
разрыхлитель — 2 ч. ложки
кукурузный крахмал — 2,5 ст. ложек
творог 0% — 180 г

Приготовление:
Морковку натереть на средней терке, добавить сахар, смешать все ингредиенты, выпекать в хорошо разогретой духовке при 180 градусах около 40 минут (до готовности).

ВЕЧЕРНИЙ ЯБЛОЧНЫЙ КОКТЕЙЛЬ С КЕФИРОМ

Вам потребуется:
Кефир — 150 мл
Яблоко — 3 шт.
Специя: корица молотая по вкусу
мед



Приготовление:
Яблоки помойте и очистите от кожуры, удалите сердцевину. Потрите их на мелкой терке или сделайте пюре с помощью блендера. Залейте их холодным кефиром и взбейте миксером. Добавьте в коктейль немного корицы и мед, снова взбейте.
Разлейте коктейль по бокалам, при желании можете украсить ломтиками яблок.

СУП ИЗ КУКУРУЗНОЙ КРУПЫ

Ингредиенты:
вода — 1,5-2 литра
крупа кукурузная — 0,5 стакана
картофель — 5 штук
морковь — 1 штука
лук репчатый — 1 штука
соль — по вкусу
перец черный молотый — по вкусу
зелень — по вкусу
сливочное масло — по вкусу

Приготовление:
Подготовим необходимые для супа продукты. Воду ставим на огонь и доводим до кипения, солим.
Кукурузную крупу нужно сначала перебрать от мусора, камешков, очень тщательно промыть под водой. Вымывайте до тех пор, пока в миске не останется лишь кукуруза.
В кипящую воду кладем крупу. Доводим до кипения и уменьшаем огонь, варим при приоткрытой крышке до готовности кукурузы. По времени это займет минут 40.
Когда крупа будет почти готова, порежьте лук и морковь.
Порежьте картофель.
Закладываем овощи в суп и варим все еще 20 минут.
Готовый суп заправляем зеленью, можно добавить кусочек сливочного масла.

ЛЮБОПЫТНЫЙ ФАКТ

ЖЕНЩИНА УЗНАЛА О БЕРЕМЕННОСТИ ВО ВРЕМЯ РОДОВ

47-летняя американка Джуди Браун выяснила, что беременна, всего за час до появления на свет своего первого ребенка.



4 ноября 2015 года Джуди поступила в больницу Беверли (штат Массачусетс) с жалобами на боли в животе, которые становились все сильнее, пишет Yahoo Parenting. Женщина подозревала у себя камни в желчном пузыре, однако ее ждал настоящий шок: осмотр показал, что у нее доношенная беременность и уже начались роды. Через час на свет появилась здоровая девочка весом 3 600 граммов, которую назвали Кэролин Роуз.

Джуди и ее 48-летний муж Джейсон, с которым они женаты уже 22 года, до сих пор пребывают в потрясении. «Мне все кажется, что я сейчас проснусь и все это окажется лишь сном», — признался Джейсон, который не спускает малышку с рук и называет ее «папиной доченькой».

Как рассказала Джуди, когда у нее прекратились менструации и начал расти живот, она была уверена, что это симптомы менопаузы. Обычно менопауза наступает в 52-53 года, но иногда — раньше или позже. Шансы на овуляцию в этот период очень низки, но все же не равны нулю, пояснила акушер-гинеколог Ифат Хоскинс из Медицинского центра Лангон при Нью-Йоркском университете.

Не так давно ученые выявили четыре гена, вариации в которых ответственны за замедление процессов старения организма. У женщин — носительниц таких вариаций яичники функционируют активнее и дольше, чем у остальных, что и объясняет их способность к позднему зачатию.

deti.mail.ru

ВАКЦИНАЦИЯ ПРИ БЕРЕМЕННОСТИ

СТОИТ ЛИ ДЕЛАТЬ ПРИВИВКИ БЕРЕМЕННЫМ?

Сезон простуд не за горами, и никто из нас не застрахован от гриппа. Сегодня мы поговорим о том, стоит ли беременным прививаться от этого вируса и делать какие-либо прививки вообще?



В США и Европе сейчас появился интересный тренд — прививку от гриппа делают не только будущей матери, но и младенцу в утробе. Некоторые беременные пошли еще дальше — они делают прививку АКДС для того, чтобы обеспечить малышу иммунитет еще до его рождения. Могут ли такие внутриутробные прививки быть опасны для мамы или ребенка? Наш первый эксперт — акушер-гинеколог Александра Борисова — считает, что прививки полезны и делать их нужно как можно раньше, даже если младенец еще не родился.

Второй эксперт — акушер-гинеколог Виктория Авдеева — наоборот, категорически не рекомендует прививки своим пациенткам. По ее мнению, АКДС — одна из самых опасных прививок для женщины в положении, ведь вакцина сделана из живых микробов и очень токсична.

deti.mail.ru

Страницу подготовила Анна ВОЛОДАЩУК

ВОПРОС ЮРИСТУ

КАК ЛИШИТЬ РОДИТЕЛЬСКИХ ПРАВ ОТЦА МОЕГО СЫНА?

«Хочу лишить родительских прав отца моего сына. В жизни сына он никакого участия не принимает, алименты не платит. Куда в первую очередь надо обратиться, какие документы для этого надо, сколько стоит подать заявление в суд о лишении родительских прав отца?» — спрашивает наша читательница Елена.

—Уклонение от воспитания и содержания ребенка, согласно ст. 80 Кодекса Республики Беларусь о браке и семье, является основанием для лишения родительских прав. Лишение родительских прав производится только в судебном порядке. Соответственно, для того чтобы обратиться в суд, надо составить исковое заявление.

Истцы по искам о лишении родительских прав от уплаты государственной пошлины освобождаются (п. 1 ст. 257 Налогового кодекса Республики Беларусь), — ответил на вопрос читательницы юрист-эксперт Олег Манцевич.

Микола КОНОНОВИЧ

МОБИЛЬНЫЙ РЕПОРТЕР

ДРУЗЬЯ!
У нас действует рубрика «МОБИЛЬНЫЙ РЕПОРТЁР». ЕСЛИ на Вашем смартфоне или планшете есть интересные фотографии или видео, которыми Вы хотите поделиться с нашими читателями, присылайте их нам на номер (8 029) 133-04-21 С помощью приложения Viber.
АВТОРЫ самых интересных фотографий и видеороликов БУДУТ отмечены!

З ПОЛЬСКАГА ДЗЁННІКА

ЯК ВЫЖЫЦЬ СМІ?

АДКАЗ ПОЛЬСКАЙ ГАЗЕТЫ — РАБІЦЬ БОЛЬШ ПРАДУКТУ

Падчас паездкі ў Польшчу карэспандэнту «ГС» давялося пабываць у рэдакцыі аднаго з самых вядомых польскіх выданняў — «Газеце выборчай».

Экскурсію па рэдакцыі для журналістаў з чатырох краін — Беларусі, Малдовы, Таджыкістана і Туніса — правёў супрацоўнік газеты Вадзім Макаранка, які ўзначальвае ў рэдакцыі аддзел дата-журналістыкі.

Вадзім Макаранка — беларус, родам з Брэста, скончыў Варшаўскі ўніверсітэт і 16 гадоў працуе ў «Газеце выборчай» эканамічным аглядальнікам. Ён першым у Польшчы стварыў рэсурс, прысвечаны менавіта дадзеным, аўтар некалькіх кніг.

«Газета выборча» пачала выходзіць з 1989 года для інфармацыйнай падтрымкі незалежнай федэрацыі прафсаюзаў «Салідарнасць» падчас передвыбарнай кампаніі. Адсюль і яе назва — «Выборча».

Газета была першым легальным выданнем, якое было ў апазіцыі да ўлады.

Першы нумар з васьмі палос выйшаў накладам 150 тысяч асобнікаў. З лістоўкі газета ператварылася ў агульнанацыянальны штодзённік, які выдаецца сёння кожны дзень на 80 старонках фармату А3 накладам 500-800 тысяч экземпляраў. Друкуецца выданне ў трох друкарнях краіны.

Калі першая рэдакцыя «Выборчай» размяшчалася ў зачынутых дзіцячых яслях, то цяпер яна месціцца ў трохпавярховым будынку. З газеты вырас медыя-холдынг Agora, дзе працуе каля 3 200 чалавек.

Галоўным рэдактарам з самага пачатку газеты быў і застаецца вядомы польскі дысідэнт Адам Міхнік. Зараз ён адказвае за папяровую версію, а менавіта за публіцыстыку.

З цягам часу газета змяніла свой стыль — стала менш удзяляць увагі палітыцы, аддаўшы перавагу навінам, чыстай інфармацыі. Газета не прапагандуе чые б то ні было палітычныя погляды.

Інтэрнэт забраў у прэсы частку рэкламадаўцаў, і СМІ сталі вяртацца да таго, што іх сталі фінансаваць чытачы. Калі раней больш за 80% даходаў складала рэклама, то сёння ў газеце гэта толькі 50%, і будзе яшчэ менш, зазначае Вадзім Макаранка. Гэта датычыцца ўсіх заходніх краін.

Як выжыць СМІ? Адказ «Газеты выборчай» — рабіць усё больш прадукту, найперш за ўсё — лічбавага. Лічбавыя праекты пры гэтым прыходзіцца дубляваць папяровай прадукцыяй. Дзве трацінны папяровых дадаткаў «Газеты выборчай», як адзначае гід Вадзім Макаранка, утворана за апошнія тры гады, яны маюць і свае анлайн-вітрыны — напрыклад, дадаткі для жанчын, спартсменаў і г.д.

Заробкі журналістаў у газеце ў лепшыя часы, пры добрых рэкламных патоках, былі фіксаваныя, а пасля скарачэння рэкламы пачалі падаць. Рэдакцыя стала пераводзіць супрацоўнікаў на ганарарную аснову: журналіст атрымлівае мінімальную базавую зарплату плюс ганарар. Адсюль ідзе заахвочванне да працы. Паводле Вадзіма Макаранкі, пры такой форме працы сувязі рэдакцыі з аўтарамі слабеюць, бо журналісты могуць прадаваць свае матэрыялы ў іншыя рэдакцыі. Каб затрымаць лепшых супрацоўнікаў, для іх усталёўваецца фіксаваная аплата працы, але гэта невялікая група работнікаў.

Сёння ў СМІ паўстала пытанне: наколькі рэдакцыя, акрамя падачы фактаў, павінна дэманстраваць сваю пазіцыю, ці рэдакцыйную лінію, па той ці іншай праблеме? Газета лічыць, што рэдакцыйная лінія павінна быць прыкметнай, і найперш у каментарах. Выданні, якія робяць гэта адкрыта і моцна, лепш прадаюцца.

Наталля ІВАНОВА
Фота аўтара



Польскія журналісты ганарацца тым, што ўпершыню Нобелеўскую прэмію заслужыў калега — рэпарцёр Святлана Алексіевіч



Вадзім Макаранка (злева) праводзіць экскурсію па рэдакцыі «Газеты выборчай»



У рэдакцыі

МНЕНИЕ

ИМИДЖЕВАЯ ДЕНОМИНАЦИЯ ИЛИ НОВЫЙ КУРС В ЭКОНОМИКЕ?

В Беларуси 1 июля 2016 года будет проведена очередная деноминация белорусского рубля. Деноминация — изменение нарицательной стоимости денежных знаков после гиперинфляции с целью стабилизации валюты и упрощения расчётов.

Как сообщили в пресс-службе главы государства, Александр Лукашенко 4 ноября подписал указ №450 «О проведении деноминации официальной денежной единицы Республики Беларусь».

Напомним, что последняя деноминация была проведена в нашей стране в 2000 году, когда миллионы превратились в тысячи, до этого деноминация случилась в 1994 году.

Деноминация будет произведена путем замены находящихся в обращении банкнот образца 2000 года на банкноты и монеты образца 2009 года в соотношении 10 000:1. То, что и монеты, и банкноты образца 2009 года, намекает, что деноминацию планировали провести еще в 2009-м, но, видимо, помешал мировой экономический кризис. Самая мелкая на сегодня купюра — 100 рублей — будет заменена на самый низкий номинал нового денежного ряда — 1 копейку. И это значит, что в стране впервые с обретением независимости в 1991-м появятся свои монеты.

С 1 июля по 31 декабря 2016 года денежные знаки старого образца будут находиться в параллельном обороте, они обязательны к приему при всех видах платежей без ограничений в указанном выше соотношении.

Факт из истории: в 1992 году на территории Республики Беларусь находились в обращении белорусские рубли, так называемые зайчики, советские рубли, российские рубли и ноу-хау перестройки — продовольственные купоны.

Теперешняя деноминация — это скорее не экономический, а имиджевый ход по политическим причинам: просто не престижны купюры с большим количеством нулей. Но также она может означать, что власти взяли курс на экономические реформы и ознаменовали его начало заменой денежных знаков.

Как бы то ни было, главное, чтобы не случилось очередной крупной инфляции, а то отчеканенные монеты уже можно будет выводить из оборота через несколько лет.

Никита ПАСТУХОВ

ЭКОНОМИКА

ХЛЕБНЫЙ КАРАВАЙ РАЙОНА ЗАВЕСИЛ БОЛЕЕ ДЕВЯНОСТА ТЫСЯЧ ТОНН

Одиннадцать караваев, испечённые в разных сельских хозяйствах района, были представлены на выставке, которая проходила на празднике хлеборобов в агрогородке Жировичи. Торжество это было посвящено Дню работников сельского хозяйства и перерабатывающей промышленности агропромышленного комплекса. Лучшие караваи — РУСП «Победитель» и СПК «Сеньковщина» — затем были представлены и на областных «Дожинках».



Руководителю района Олегу Таргонскому вручают каравай

На открытии праздника руководителю района Олегу Таргонскому был вручён главный каравай Слонимщины, испечённый из муки нынешнего урожая.

Как было отмечено на празднике, всего в уборке зерновых было задействовано 97 комбайнов. А комбайновый экипаж Евгения Прошкина и Вадима Парасоцкого из СПК им. Суворова установил рекорд на жатве этого года, намолотив 2 027 тонн зерна.

— Хлебный каравай района этого года — 90,3 тысячи тонн, урожайность составила 41,5 центнера с гектара, — отметил начальник сельхозуправления Слонимского райисполкома Василий Семёнов.

В этот день по результатам труда были поощрены более ста тружеников села.

Татьяна ПЛАХЕТКО
Фото автора
Фоторепортаж и видеосюжет смотрите на сайте gs.by

К слову

Как отметил Василий Семёнов, в настоящее время в сельскохозяйственной отрасли Слонимщины трудится около трёх тысяч человек.

За январь-октябрь произведено валовой продукции сельского хозяйства на сумму 658,4 миллиарда рублей. Наибольшего прироста достигли в филиале «Павлово-Агро» ОАО Слонимский мясокомбинат», СПК имени Суворова, СПК «Дружба-Агро», СПК «Деревновский».

В текущем году в районе получено 4,1 тысячи тонн картофеля, 6,8 тысячи тонн рапса, заготовлено на зиму более 45 тысяч тонн кормовых единиц травянистых кормов. За текущие десять месяцев в Слонимском районе произведено 45,117 тонны молока, что составило 101,1% к уровню прошлого года. Также произведено 5,3 тысячи тонн мяса крупнорогатого скота, мяса свиней — 1,7 тысячи тонн и 38,8 миллиона штук яиц.

ОБРАЗОВАНИЕ

ОНИ ХОТЯТ СТАТЬ ПРАВОВЕДАМИ

В Слонимском лицее на прошлой неделе состоялось традиционное посвящение в учащиеся обществоведческого направления.

Десятиклассники этого учебного заведения получили удостоверения учащегося юридического класса и погоны из рук начальник Слонимского районного отдела внутренних дел полковника милиции Александра Трухана.

В этот день в адрес ребят звучали напутственные слова от директора лицея Татьяны Казакевич, председателя ветеранской организации милиции Николая Юрчика, священника Евгения Казука и многих других. Свой наказ им дали старшие товарищи, учащиеся 11-го класса обществоведческого направления. Стоит отметить, что своё поздравление лицеистам, которое было зачитано в зале, прислал начальник Академии МВД Республики Беларусь генерал-майор Владимир Бачила.

Выступили и сами десятиклассники. Они рассказали всем присутствующим о своих интересах и устремлениях. Теперь девизом своей жизни они избрали слова «Совесть. Доверие. Честь».

Самым волнующим моментом мероприятия стало произношение клятвы лицеистов.

В конце праздника все присутствующие исполнили гимн лицея стоя.

В этот день между Слонимским РОВД и лицеем был подписан договор о сотрудничестве. Договор подписали начальник Слонимского районного отдела внутренних дел Александр Трухан и директор лицея Татьяна Казакевич.

Татьяна ПЛАХЕТКО
Больше фото на gs.by


Подписали договор о сотрудничестве


Будущие правоведы

СПОРТ

ШАНСЫ НА ПОБЕДУ У СЛОНИМСКИХ КИКБОКСЕРОВ ЕСТЬ

Беларусь уже давно находится на ведущих позициях по тайскому боксу (муай тай) и кикбоксингу в мировом рейтинге. С недавнего времени этот вид спорта появился и в Слониме — открылась секция тайского бокса. Тайский бокс в городе начал развиваться во многом благодаря появлению здесь тренера Виктора Березовского. Первые слонимские спортсмены отправились на соревнование в Полоцк. Состязания будут проходить с 16 по 20 ноября.



Тренер Виктор Березовский (второй слева) и его воспитанники Владислав Постыко, Илья Рудак, Владислав Клыбик

Перед отъездом корреспондент «ГС» задал несколько вопросов тренеру слонимских кикбоксеров.

—Виктор, многие люди удивляются тому, что в таком небольшом городе, как Слоним, появилась секция тайского бокса?

—Все началось с того, что 11.11.2011 года я женился на замечательной девушке, которая родом из Слонима, и переехал к ней в город. Немного позже встал вопрос о трудоустройстве. Я долго думал, чем можно заняться, и родилась идея открыть секцию тайского бокса для детей и взрослых. Так я стал тренером. Главная задача, которая стояла передо мной, — донести детям и взрослым культуру этого вида спорта, познакомить с традициями, привить тягу к спорту и здоровому образу жизни.

— А сами Вы как давно занимаетесь тайским боксом, где тренировались, на каких соревнованиях выступали?

— С девяти лет увлекаюсь тайским боксом, начинал тренироваться в Солигорске, поскольку родился в этом городе. Потом переехал в Минск, занимался в спортивных клубах «Чинук», «К-2». Являюсь неоднократным призёром чемпионатов мира и Европы. За свою карьеру на любительском и профессиональном ринге провёл около 250 боёв.

— В каких зарубежных странах Вы успели побывать на сборах и соревнованиях? Привлекались ли в сборную Беларуси?

— Успел объездить всю Европу и многие страны мира. Побывал и у родоначальников тайского бокса в Таиланде. Почти с начала карьеры был в сборной РБ.

— Возникали ли у Вас какие-либо проблемы с открытием секции по тайскому боксу в Слониме?

— Серьёзных проблем, ставящих под риск открытие секции, не было. Были долгие поиски подходящего помещения, переговоры с директорами школ. Хотелось, конечно, все и сразу: и просторный зал, и душ, и ринг, и экипировку. Постепенно приближаемся к желаемому.

— Как оцените уровень Ваших слонимских подопечных и сколько уже работает Ваша секция?

—Секция у нас молодая, нам нет ещё и года. Уровень у детей разный, есть способные ребята от природы, а есть те, которые достигают успехов благодаря своему упорству. Конечно, идеальное сочетание — два варианта вместе. Есть ребята способные, но иногда несерьёзно относящиеся к тренировкам, пропускающие занятия. С этим боремся, пытаясь заинтересовать детей и мотивировать. Дети разные, но способности и потенциал можно увидеть почти сразу.

—Ваши подопечные впервые выступят на соревнованиях в другом городе. Как оцените их шансы?

— Мы едем на открытый Кубок Беларуси по кикбоксингу в разделе К-1. Шансы на победу у нас есть, и я уверен, что ребята приложат все усилия и покажут себя. В любом случае, участие в соревновании такого уровня будет полезно ребятам, независимо от результата.

Никита ПАСТУХОВ
Фото автора

ФУТБОЛЬНАЯ ОСЕНЬ – 2015

ЛУЧШАЯ КОМАНДА СЕЗОНА

С 9 по 11 ноября на стадионе «Газпром трансгаз Беларусь» проходил республиканский турнир по футболу среди мальчиков 2005 года рождения «Футбольная осень – 2015».


ФОТО ЕГОРА ЖИГАЛИКА

Победители турнира

Пять приезжих команд из Пинска, Гродно, Лиды, Несвижа, Берёзы и две команды хозяев — ДЮСШ №1 боролись за звание носить титул победителя турнира. Открытие соревнований прошло междусобойчиком двух команд тренера Руслана Корнева. Первые номера победили 6:1 (отличились Андрей Болван — 2, Кирилл Лосевич, Егор Климуть, Артур Малофей, Арсений Герасимчик — Евгений Михайлов).

Затем на старт вышли по очереди все команды-участницы. Накал страстей и неподдельная радость на лицах ребят носила исключительно соревновательный характер. Комбинации и забитые мячи стали украшением детского турнира. К радости поклонников слонимчан, они на сей раз оказались не гостеприимными. Команда «Слоним-2005» выиграла все свои матчи с разницей 43:2 и стала победителем.

Второй состав слонимских мальчиков оказался чуть удачливее пинчан и сумел обойти их по разнице мячей. Как итог — шестое место.

Вторыми финишировали юные футболисты из Лиды. В принципиальном матче они уступили слонимчанам 1:4 (голы у хозяев забили А. Герасимчик — 2, К. Лосевич, Н. Ращинский).

Бронзовые медали соревнований примерили игроки гродненской СДЮШОР «Неман». Матч «Слонима-2005» и «Немана» завершился победой хозяев 4:0. Все участники и тренеры были довольны приглашением на столь поучительный турнир, который, несмотря на дождливую погоду, прошёл без срывов, и пожелали, чтобы такие соревнования проводились регулярно.

Лучшим вратарём турнира «Футбольная осень – 2015» стал Матвей Ковручк из команды «Слонима-2005», лучшим защитником — Артём Васильев из гродненского «Немана», полузащитником — Александр Юркевич, нападающим — Арсений Герасимчик из «Слонима-2005».

По итогам соревнований были выявлены лучшие игроки в каждой из команд. В команде «Слоним-2005» лучшими стали Антон Семёнов и Кирилл Лосевич, «Слоним-2» — Роман Мягкий, ДЮСШ Берёза — Даниил Козеко, ДЮСШ Несвиж — Никита Лепетило, в команде СДЮШОР №3 Пинска — Владислав Гончар, ФШ Лида — Кирилл Ковальчук, СДЮШОР «Неман» Гродно — Илья Лебедев.

25-Й ЧЕМПИОНАТ БЕЛАРУСИ ПО ФУТБОЛУ

ПОРАЖЕНИЕ С ХОККЕЙНЫМ СЧЁТОМ

ФК «ЛИДА» — ФК «СЛОНИМ» — 6:4 (3:2)
15 ноября, г. Лида. Стадион «Старт», 400 зрителей.
Судья — С. Лобацевич (Витебск).
Голы: 1:0 — Лозко, 11; 2:0 — Комлев, 20; 3:0 — Петров, 33; 3:1 — Щербаков, 40; 3:2 — Холодков, 44; 4:2 — Дубай, 50; 5:2 — Дубай, 61; 6:2 — Дубай, 67; 6:3 — Шаков, 74; 6:4 — Шаков, 90+3.
«Слоним»: Савинков — Снопко (к), Жуков, Михновец (Бальбух), Пузач (Подрецкий), Щербаков, Гречиха (Палазник), Красий, Холодков (Плясунов), Шаков, Федорчук (Глебов).
Главный тренер — Алексей Шубенок

В последнем матче сезона команды порезвились на славу. Зрители, посетившие матч, остались довольны увиденным.

Дружеские переклички фанатов ещё больше обязывали футболистов идти вперёд. Град голов в обе стороны стал воплощением зрительского интереса. На игроков не довлел результат — обе команды уже заняли свои места. Наверное, это и повлияло на игру, которая прошла в атакующем ключе, а вот про оборону стали думать позже.

Несмотря на окончательный счёт в пользу хозяев, гости во многом не уступали. В первые полчаса встречи лидчане навязали сопернику свою быструю игру, а мячи стали окончанием завершения атак.

К концу первого тайма слонимчане сумели раскрепоститься и забить два мяча в ответ. Перерыв пошёл на пользу хозяевам — они вновь стали действовать в атакующем ключе. На помощь партнёрам в атакующих комбинациях пришёл Максим Дубай, его хет-трик довёл счёт до неприличного. Подсластить горечь поражения слонимчан вызвался Владимир Шаков — 6:4.

Итоговая турнирная таблица

		И	В	Н	П	мячи	О
1	Ислочь (Минский р-н)	30	20	9	1	76-24	69
2	Городея	30	21	5	4	73-25	68
3	Крумкачы (Минск)	30	19	3	8	67-45	60
4	Днепр (Могилёв)	30	17	5	8	48-21	56
5	Сморгонь	30	15	8	7	60-41	53
6	Лида	30	15	5	10	60-53	50
7	Смолевичи-СТИ	30	13	8	9	47-37	47
8	Гомельжелдортранс	30	12	8	10	45-39	44
9	**Слоним**	**30**	**13**	**2**	**15**	**41–55**	**41**
10	Звезда-БГУ (Минск)	30	10	10	10	47-47	40
11	Берёза	30	10	4	16	39-43	34
12	Химик (Светлогорск)	30	9	7	14	42-50	34
13	Барановичи	30	8	8	14	36-49	32
14	Орша	30	3	8	19	24-70	17
15	Кобрин	30	4	3	23	23-77	15
16	Речица-2014	30	2	5	23	14-66	11

Результаты 30-го тура
Смолевичи – Звезда Минск – 2:1
Гомельжелдортранс – Барановичи – 2:1
Лида – Слоним – 6:4
Орша – Берёза – 1:8
Химик Светлогорск – Ислочь – 0:2
Речица – Кобрин – 3:1
Сморгонь – Городея – 1:3
Крумкачы Минск – Днепр Могилёв – 2:0

НОВОСТИ СПОРТА



ГАНДБОЛ

ВОШЛИ В ТРОЙКУ ПРИЗЁРОВ И ПОБЕДИЛИ

В городском посёлке Ляховичи прошло открытое первенство по гандболу среди мальчиков и девочек 2004-2005 годов рождения. Всего в соревнованиях приняло участие по четыре команды среди мальчиков и девочек.

Слонимские юноши первый свой поединок уступили хозяевам, а последующие сумели выиграть. При подведении итогов команда ДЮСШ №1 заняла второе место. На фоне остальных ребят лучше себя зарекомендовали Олег Дубровко, Егор Андрушевич, Никита Духовник.

А вот девочки не подкачали и сумели одолеть всех своих соперниц из Ляховичей, Ляховичей-2 и Барановичей и стали победителями.

Команды к соревнованиям готовили Юрий Марутик и Ирина Оржинская.

ТЕННИС

ВЫЯВИЛИ ПОБЕДИТЕЛЯ

В спортивном зале ДЮСШ №1 прошло первенство по настольному теннису в программе круглогодичной спартакиады среди организаций города. Всего 13 команд вышли на старт, чтобы выявить сильнейшего.

Коллективы были разделены на две группы, затем образовался финальный квартет. В состав команды входило двое мужчин и женщина, при необходимости было два резервных игрока.

Множество игр прошло на равных, и только финальные поединки расставили команды по местам. Победителем стала команда ДСЗ в составе Елены Коротько, Валентина Коротько и Владимира Захарчука.

На втором месте — команда УМГ (Владимир Криштопчик, Сергей Симанович, Мира Сай).

Третье командное место досталось коллективу ЖРЭО, где честь организации отстаивали теннисисты Виктор Болван, Алексей Мороз, Татьяна Михно. Замкнули финальную четвёрку спортсмены мясокомбината.

ВОЛЬНАЯ БОРЬБА

СЛОНИМЧАНКА СТАЛА ЧЕМПИОНКОЙ ГРОДНЕНЩИНЫ

В областном центре прошло юношеское первенство области по вольной борьбе среди спортсменов 2001-2003 годов рождения.

Достаточно уверенно все свои поединки провела воспитанница ДЮСШ №1 тренера Александра Дудкина Диана Малико. В весе 40 кг Диане не было равных во всех четырёх схватках. Она их выиграла на туше и стала чемпионкой Гродненской области.

В дальнейшем победительнице предстоят смотрины в сборной области для выступления в спартакиаде школьников по вольной борьбе.

АФИША СПОРТИВНОЙ НЕДЕЛИ

16-20 ноября

БАСКЕТБОЛ 3Х3. Первенство Слонима. Спорткомплекс. Начало в 19.00.

ГАНДБОЛ. Первенство средних школ города среди 4-5-х классов. Спорткомплекс. Начало в 14.30.

21 ноября

Спартакиада среди сельхозпредприятий Слонимского района. В программе шашки и баскетбол. Раховичская СШ. Начало в 10.00.

Страницу подготовил Егор ЖИГАЛИК

Дзятлава



Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ
Уласны карэспандэнт «ГС» на Дзятлаўшчыне
Адрас: 231471, г. Дзятлава, а/я 31
Email: 375299518893@yandex.by

НАВІНЫ

ПЕСЕННІЦЫ АДЗНАЧЫЛІ ЮБІЛЕЙ

Мясцоваму фальклорнаму гурту народнай песні ў вёсцы Студзераўшчына споўнілася 40 гадоў.

Ён унікальны тым, што жанчыны, а іх шэсць, выконваюць народныя песні, што спявалі ў гэтай мясцовасці шмат дзесяцігоддзяў таму. Песенніцы — пераможцы розных фестываляў фальклору, маюць шмат узнагарод.

На юбілей у Студзераўшчыну сабралася шмат гасцей з цёплымі віншаваннямі і памятнымі падарункамі для самадзейных артыстак, чый унёсак у скарбонку беларускай культуры цяжка пераацаніць.

Спявалі госці, спявалі і самі віноўніцы ўрачыстасці. Быў тут і першы кіраўнік калектыву Антон Гузарык. Як і ўсе, ён пажадаў таленавітым песенніцам вялікіх поспехаў на ніве самадзейнага мастацтва, здароўя і натхнення.

З ЛЮБОЎЮ ДА ВЯСКОЎЦАЎ

Супрацоўнікі Жукоўшчынскага сельскага Дома культуры разам з народным тэатрам-студыяй «Прымакі» паказалі канцэртную праграму ў вёсках Нагародавічы, Нясілавічы і Погіры. Называлася яна «З любоўю да вас».

У праграме былі песні, жарты, танцы. Гледачам, канешне, спадарожнічаў добры настрой.

Людзі вельмі ўдзячны самадзейным артыстам за такі цудоўны культурны падарунак.

НА ЖЫЦЦЁВЫХ СКРЫЖАВАННЯХ

ТВАЁ ЗЛО ТАБЕ І ВЕРНЕЦЦА

Ніхто ў вёсцы Альшанікі нават не здагадваўся, чаму нямоглая ўдава Аліна Кулакоўская перапісала сваю хату на старэйшага сына Мікіту. Хата дабротная, вялікая, і вёска не якая-небудзь выміраючая. Дзіва было таму, што Мікіта меў у райцэнтры Верняні трохпакаёвую кватэру ды яшчэ катэдж за горадам будаваў.



МАЛЮНАК ЯЎГЕНА ІВАНОВА

—Ці ты не здурнела, Аліна? — спытала ў яе суседка Караліна Захарэўская. — У малодшага твайго Юры пяцёра дзяцей, і жыве ён небагата, а хату гэтаму куркулю. Ці не занадта яму?

Ціхая, затурканая жыццёвымі нягодамі, да таго ж і хваравітая Аліна ўжо і сама не рада была таму, што зрабіла, але назад не павернеш.

—Угаварыў ён мяне, Каралінка, — казала з сумам. — Абяцаў, што калі падару яму хату, то яны з жонкай Нінай будуць даглядаць мяне, як пані. Так і сказаў: «Не будзеш, маці, ні ў чым мець патрэбы. Захочаш, то ў катэджы, што неўзабаве дабудую, жыцьмеш, а не, то ў кватэры. У мяне ўсяго ўволю, будзеш як сыр у масле катацца».

—Чаму ж не ўволю?.. Яго адзіны сын жыве ў сталіцы, кажуць, мае там свой бізнес. Ды і Мікіта ж свой бізнес у райцэнтры мае. Але людзі вельмі скардзяцца, хто ў яго працуе. Маўляў, і плаціць мала, і заробак не аддае па некалькі месяцаў. А грашыскаў у яго і куры не клююць. Ды што цяпер гаварыць. Падарыла ты дом, як усё адно сваімі рукамі падпаліла яго. Паглядзіш, галубка, не будзе табе ў Мікіты жыцця...

Кабета як у ваду глядзела. Праз пару дзён старэйшы сын прывёў на падворак пакупнікоў, а маці завёз і пасяліў не ў шыкоўных пакоях, а ў летняй кухні, што пабудаваў паблізу катэджа.

—Пажывеш і тут, не пані нябось, — сказаў старэнькай. — Восень сёлета цёплая, а калі пахаладае, то тут печка ёсць. Дроў я прывязу.

—То навошта ты выманіў у мяне хату, раз хочаш яе прадаць?

—Навошта? А я скажу: вытворчасць сваю буду пашыраць, грошы вельмі патрэбны. А хату на дачу купляе адзін важны чалавек. Я з яго дорага не вазьму, а ён мне дапаможа адну справу зладзіць.

У летняй кухні Мікіта паставіў стол, два крэслы, аднекуль прывалок стары ложак з расцягнутымі спружынамі. Няйначай на нейкім сметніку знайшоў, бо цяпер ужо на такіх ніхто не спіць.

—Што ж я, дурная, нарабіла?! — плакала Аліна, седзячы ля печкі, у якой гарэла полымя. — Трэба было на дваіх сыноў хату запісаць, то і Юру нешта дасталося б, а так яго вельмі пакрыўдзіла...

Ні Мікіта, ні яго жонка Ніна да бабулькі ніколі не заглядвалі. Яна сама хадзіла ў магазін па прадукты, мыла бялізну ў тазіку, насіла дровы.

Аднойчы, калі прыйшла ў магазін па хлеб, сустрэла Ванду Угрыновіч са сваёй вёскі.

—Ну, як жа ты тут? — спагадліва спытала Ванда. — Выглядаеш кепска: вочы ўваліліся, нейкая белая з твару. Баліць што?

—Душа баліць, мая ты галубка. Шкадую аб тым, што зрабіла, ох, як шкадую! Юрачку свайго пакрыўдзіла, усё адно як розум у мяне хто адняў.

—А ці ж ты ведаеш, што ў твайго Юры меншы сынок вельмі хварэе, Андрэйка? У раённай бальніцы крыху ляжаў, а цяпер у абласную завезлі. Кажуць, і там не папраўляецца...

—Не, не ведаю... — голас у Аліны раптоўна ахрып, дыханне перахапіла.

—Кажуць, трэба аперацыю рабіць, вельмі складаную, за мяжой. Шмат грошай каштуе такая аперацыя, а дзе ў іх з Юляй грошы? Дзеці як боб сыпаліся адно за адным. А заробкі ў калгасе сама ведаеш якія.

—Ой, ты мяне проста забіла гэтай весткай! — прыхіліўшыся да сцяны магазіна, мовіла Аліна. — А можа, я ў Мікіты папрашу грошай на тую аперацыю? Можа, дасць?

—Не ведаю, табе, можа, і дасць, а Юру не даў. Ён мне сам казаў, што на мінулым тыдні ездзіў да старэйшага брата, але той нават і гаварыць не захацеў. Маўляў, самому грошы патрэбны, усё ў бізнес уклаў.

Аліна забылася, што мелася купіць. Не заходзячы дадому, пайшла ў сынаву кантору, ці, як цяпер называюць, офіс. Вялікая чорная Мікітава машына стаяла ля ганку, і маці абрадавалася, што не прыйдзецца чакаць. Не зважаючы на сакратарку, якая лапатала нешта аб занятасці Мікіты Сымонавіча, пашыбавала проста ў кабінет.

—Чаму ты, сынок, такі злы і бяздушны?! — пачала з парога. — Чаму Юру грошай не даў на аперацыю для дзіцяці? Я табе аднаму дом адпісала, а ты цяпер во што вырабляеш!

—Старая, зачыні дзверы з таго боку! — ажно прыўзняўся за сталом Мікіта. — Я табе не дабрачынны фонд, каб выдзяляць грошы на ўтрыманне яго табара. Трэба было думаць галавой, перш чым пладзіць галоту. Так што не дам і не дам!

—Запомні, тваё зло табе і вернецца! — як праклён выкрыкнула Аліна і на аслабелых, нібы чужых нагах выйшла з кабінета.

На аперацыю для маленькага Алінінага ўнука збіралі грошы ўсёй ваколіцай. І вяскоўцы, і многія жыхары райцэнтра, і нават зусім далёкія людзі, што даведаліся пра такую бяду. І Аліна напазычала ў знаёмых, такіх жа бедных пенсіянерак, як сама, слёзна абяцала аддаць. Людзі давалі, не вельмі спадзеючыся, што старая змарнелая жанчына здолее некалі вярнуць.

Праз некалькі месяцаў Андрэйку зрабілі аперацыю ў Германіі, і ён пайшоў на папраўку. Гэта было ў канцы зімы, а летам ужо разам з сябрамі бегаў па вуліцы, быў жвавы і вясёлы.

Мікіта з жонкай жылі ў новым катэджы, і старая маці з акна летняй кухні ўсякі раз бачыла, як ён на сваёй шыкоўнай машыне ад'язджаў на работу ці вяртаўся назад. Яна пільнавала і вельмі хвалявалася, бо ведала, што старэйшы сын часта садзіцца за руль на добрым падпітку. Іншы раз ён браў з сабой жонку, каб яна вяла машыну.

У той вечар яны паехалі на юбілей да нейкага раённага начальніка. Вядома, аб гэтым ёй не сказалі, але сказала служанка, што прыбірала ў пакоях катэджа і варыла есці. Гаваркая Міра была ў добрых адносінах са старэнькай. Іншы раз прыносіла ёй якіх-небудзь прысмакаў, што гатавала для сына і нявесткі. Спачатку Аліна адмаўлялася, але Міра ўгаварыла:

—Не ў каго чужога бяру, а ў вашага сына. Ён, каб быў добры, і сам загадаў бы карміць вас як належыць. Але ж каб быў добры, то вы не жылі б у гэтым сырым закутку. Нелюдзь ён, не ў крыўду вам скажу.

—Якая тут крыўда, Мірачка. Сама пра гэта не раз думаю...

Сядзела ля акна да ночы, але сынавай машыны ўсё не было. Трывога з'ядала сэрца, бо так доўга яны яшчэ не баwіліся ні ў якіх гасцях. А раніцай Міра зайшла з бутэлечкай карвалолу напагатове і паведаміла, што машына трапіла ў аварыю. За рулём была нявестка. Яна загінула на месцы, а сын вельмі пакалечаны ляжыць у рэанімацыі.

Мацярынскае сэрца не памятае крыўды. Праз якія паўгадзіны Аліна ўжо была ў бальніцы. Да сына не пусцілі, і яна сядзела ў калідоры і ледзь не галасіла. Нехта пазваніў Юру, і ён таксама прымчаў сюды.

У бальніцы Мікіта праляжаў амаль паўгода, але карысці было мала. Дактары сказалі, што ён не зможа хадзіць.

—Калі няма каму даглядаць, то мы будзем афармляць Мікіту Сымонавіча ў дом інвалідаў...

—Ёсць каму даглядаць, — абнадзеіў Юра. — Я забяру яго да сябе, і маму забяру. Разам будзем жыць. Ён жа не адзінокі, каб гараваць у доме інвалідаў.

Аліна слухала гэта, і слёзы душылі яе. Гэта былі слёзы ўдзячнасці свайму малодшаму сыну, чыё добрае сэрца не ведае зла, не памятае крыўды...

— наш край

ПАДЗЕЯ

УСЕ МЫ ЗВЯЗАНЫ З ВЁСКАЙ ПУПАВІНАЙ

У Дзятлаве прайшлі абласныя «Дажынкі».

Нарэшце прыйшло гэта доўгачаканае свята і на нашу вуліцу, а дакладней, у гарадок. Мы доўга рыхтаваліся да яго: будавалі, рамантавалі, упрыгожвалі. І Дзятлава змянілася непазнавальна.

Свята мелася быць цудоўным, але напярэдадні некалькі дзён запар ліў дождж. У чацвер пад вечар, калі ўжо цямнела, людзі з многіх раёнаў абсталёўвалі свае гандлёвыя месцы, не адкладваючы гэту справу на заўтра. Рупіліся, не зважаючы на дождж.

Гэты дождж-свавольнік, якога не маглі дачакацца ўлетку, відаць, хацеў сапсаваць свята. Ды не ўдалося! Вецер пашкадаваў людзей і разагнаў хмары. Нават сонейка час ад часу паблісквала.

Як толькі развіднела, на плошчы 17 Верасня, на вуліцах Савецкай, Міцкевічва, у гарадскім парку і іншых мясцінах пачалі збірацца людзі, загучала музыка. Потым тут, так бы мовіць, яблыку не было дзе ўпасці.

Роўнымі радамі стаялі прыгожа абсталяваныя гандлёвыя кропкі: то палаткі, то імпрвізаваныя магазіны. На плошчы ўсім кідалася ў вочы маляўнічае падвор`е «Дзятлаўшчына запрашае». На ім у прыгожых карзінах фрукты, агароднiна. Побач — добразычлівыя дзятлаўчанін і дзятлаўчанка.

На вуліцы Міцкевіча размясціўся цэлы рад з выставамі народных рамёстваў. Умельцы з усіх раёнаў выставілі тут свае творы. Гэта і вырабы з саломкі, і карціны, і шмат што яшчэ. Проста вочы разбягаліся ад такога хараства! Разам з іншымі паказалі такую прыгажосць і дзяўчаты з Дзятлаўскага раённага дома рамёстваў Марына Лашкоўская і Марына Лотыш. Карзінкі, лялькі, цацкі прапаноўвалі яны гасцям.

Крышку далей ад іх на супрацьлеглым баку вуліцы гасцінная Ала Сідорык запрашала на «Зэльвенскі падворак». На ім вырабы з керамікі, прыгожыя ручнікі, разьба па дрэве. Усяго і не пералічыць.

Шмат прыгожых вырабаў з саломкі, дрэва, гліны прапаноўваюць удзельнікам і гасцям свята мілыя дзяўчаты з Мастоўскага цэнтра рамёстваў Таццяна Вангул і Вольга Вайтовіч.

Ля другога «Дзятлаўскага падвор`я» на хвілінку спынілася вядучы метадыст раённага аддзела культуры Таццяна Янушкевіч. Яна разам з калегамі нямала папрацавала над афармленнем свята і вельмі хвалявалася: каб жа спадабалася!

Сапраўдны магазін разгарнулі на вуліцы Савецкай працаўнікі Слонімскага мясакамбіната Вольга Мароз, Вольга Траскевіч, Святлана Тычынская, Алена Тышко, Вольга Зайкоўская і Вольга Анішчык. Прадукцыю гэтага мясакамбіната дзятлаўчане ведаюць і любяць, бо яе часта прывозяць у нашы магазіны.

Як кажуць, не хлебам адзіным жыве чалавек. Супрацоўнікі Дзятлаўскага краязнаўчага музея таксама прaвезлі на свята свае адмысловыя сувеніры.

Ашмяны і Свіслач, Смаргонь і Ваўкавыск, а таксама Ліда, Карэлічы, Навагрудак і ўсе астатнія райцэнтры прадставілі на свяце лепшыя майстры народнай творчасці. Напрыклад, Марыя Ганчар з Ліды парадавала дзівоснымі вырабамі з саломкі і карзінкамі, якія памайстэрску сплёў яе муж.

А цяпер пра тых, у чый гонар ладзілася свята, хто, без перабольшвання, корміць нас. Апоўдні па вуліцах прайшла калона перадавікоў сельскагаспадарчай вытворчасці — гордасць вобласці. Яна накіравалася ў раённы цэнтр культуры, дзе іх павіншавалі і ўзнагародзілі, а таксама парадавалі добрым канцэртам.

Дня нас, дзятлаўчан, вельмі прыемна, што на «Жніве-2015» першае месца заняў наш зямляк Уладзімір Гукіш з СВК "Граніт-Агра». І на пераvозцы збожжа таксама першынство заваяваў Віталій Болтач з гэтай жа гаспадаркі.

Парадаваліся мы і за выдатных працаўнікоў з іншых мясцін: вадзіцеля СВК «Прыгранічны» Ашмянскага раёна Аляксея Чарняўскага, камбайнера СВК імя Дзяншчыкова Гродзенскага раёна Васіля Гузарэвіча, вадзіцеля СВК «Жухавічы» Карэліцкага раёна Ігара Садкоўскага і многіх іншых.

На «Дажынках» ушаноўвалі таксама выдатных працаўнікоў усіх галін сельскагаспадарчай вытворчасці. Для ўсіх іх спяклі дзівосны каравай.

Амаль да ночы ў Дзятлаве гучалі песні, выступалі вядомыя і невядомыя артысты. Усе падарылі нам радасць.

Што б там ні казалі, а людзям вельмі патрэбна такое свята. Усе мы карыстаемся плёнам працы вяскоўцаў і ўсе, так бы мовіць, звязаны з вёскай пупавінай.

Фота аўтара і Яўгена ВАЛАДАШЧУКА



Ала Сідорык запрашае на «Зэльвенскі падворак»



Спаборнічаюць


Дзяўчаты з Дзятлаўскага дома рамёстваў Марына Лашкоўская (злева) і Марына Лотыш



Ідуць працаўнікі Слонімскага раёна


Добра са сваім кухарам



Язэп ПАЛУБЯТКА
Уласны карэспандэнт
«ГС» у Мастах
Адрас: 231600,
праспект Юнацтва, 12/21
Email: jazep.2004@tyt.by
Тэл: +37529 126-46-92

НАВІНЫ

НА МАСТОЎШЧЫНЕ ПІЦЬ ВАДУ З КАЛОДЗЕЖА НЕБЯСПЕЧНА

На Гарадзеншчыне завяршаецца рэалізацыя праграмы «Чыстая вада», мэта якой — пашырэнне забеспячэння насельніцтва пітной вадой нарматыўнай якасці.

Падчас правядзення грамадскай кампаніі «Спынім нітраты — ціхіх забойцаў», мэтай якой быў маніторынг забруджанасці пітной вады нітратамі на Мастоўшчыне, былі ўзяты на аналізы пробы вады з калодзежаў у раёне. Вынікі несуцяшальныя: толькі ў адным з 15 калодзежаў утрыманне нітратаў не перавышае дапушчальную норму.

Агулам Мастоўскі раён мае самыя высокія ў вобласці паказчыкі перавышэння хімічных рэчываў у грамадскіх і індывідуальных калодзежах.

Жахлівы стан грамадскіх калодзежаў у Мастах. Звонку яны маюць прыгожае афармленне, але ў большасці сваёй імі ніхто не карыстаецца, паколькі яны засмечаныя. Асабліва тое датычыць вуліцы Савецкай.

ЗДАРЭННЕ

У ЯРЧАКАХ ПАДПАЛ

Пра пажар у вёсцы Ярчакі супрацоўнікі Мастоўскага аддзялення МНС атрымалі паведамленне 15 лістапада ў дзве гадзіны ночы. Гарэла гаспадарчая пабудова.

У выніку пажару згарэла страха, пашкоджаны сцены.

Як мяркуецца, прычына здарэння — падпал. Ідзе высвятленне, якая асоба яго ўчыніла.

Масты —

ВЯДОМЫ МАСТАЎЛЯНІН:
«УСЁ Ў ЖЫЦЦІ ЗБЫЛОСЯ,

Адзін з самых харызматычных вядучых «Радыё Гродна», вядучы «Барадатага шоу», распавёў пра асаблівасці працы ў прамым эфіры, мінулае пажарнага і тое, чаму яго называюць «галоўнай гуссю горада».

«Барадатае шоу» слухае ці не кожны маршрутчык у горадзе, а голас Дзімы з раніцы можна пачуць у крамах ды кавярнях. Яго называюць адным з самых папулярных людзей горада. Хто ён на самай справе?

Чэкан-пажарны: бывала і 19 выклікаў за суткі

Мы сустрэліся ў новай кавярні «Наша кава». Здаецца, тут яго таксама ведаюць усе. Ён усміхаецца і па-заліхвацку вітаецца з бармэнам.

— Не надакучвае такая папулярнасць?

— Ні кропелькі, — толькі ўсміхаецца Дзмітрый. — Я ніколі не адчуваю яе. У нас маленькі горад, і ў прынцыпе ўсе ведаюць адзін аднаго. Можа, мяне трохі больш за іншых. Бываюць вельмі добрыя моманты, калі на вуліцы падыходзяць нейкія дзядзькі, паціскаюць руку і кажуць: братан, тое, што ты робіш — гэта вельмі файна!

— Дык хто ты?

— Я былы пажарны-выратавальнік.

Адказ трохі збянтэжыў.

— Як атрымалася, што ты быў выратавальнікам, а зараз тэле- і радыёвядучы?

— Я вучыўся на юрыдычным факультэце і, каб не ісці ў войска, пайшоў працаваць у МНС. Я сапраўды марыў пра тое, каб быць міліцыянерам ці пажарным. Яшчэ са школы я думаў, што гэта маё. Калі паступіў ва ўніверсітэт, вырашыў, што трэба забіць двух зайцоў адразу: пайшоў працаваць выратавальнікам і вучыўся на завочцы. Спачатку думаў, што адпрацую года паўтара. А потым мяне зацягнула. Як вынік — пяць гадоў службы.

— Так спадабалася служыць?

— Ведаеш, служба добрая і людзі побач нармальныя, а вось як пажар, то хоць адразу звальняйся, — гаворыць Дзмітрый, і ў першыя імгненні я нават не разумею, што гэта жарт. Але хутка ён сам пачынае смяяцца і ўжо сур'ёзна дадае: — На самай справе мне падабалася гэтая праца, мне здавалася, ды і зараз здаецца, што я рабіў нешта вартае. Па-мужчынску вартае. Я ратаваў людзей, тушыў пажары. Я з задавальненнем успамінаю тыя гады. Аднойчы было 19 выклікаў за суткі. Але нейкіх яркіх момантаў я асабліва не памятаю. Справа ў тым, што кожнае дзяжурства — гэта ўсплёск адрэналіну. І вельмі яркі выпадак з жыцця, але які потым сціраецца, таму што так кожныя суткі, калі ты заступаеш на дзяжурства.

— Чаму ты сышоў са службы?

— У нейкі момант я зразумеў, што ўсё, хопіць. Здаецца, сваё я адслужыў. Служба ў пагонах трохі змяніла мой светапогляд. Але я зразумеў, што надалей я не хачу сябе бачыць у гэтай структуры. Справа ў тым, што праца ў ваенізаванай структуры — гэта такі прамы шлях — зразумелы і выразны. Але я выбраў іншы — жыццё творчага чалавека. Тады я вучыўся ва ўніверсітэце і паралельна гуляў у КВЗ. Мне гэта вельмі падабалася.



Дзмітрый Чэкан у студыі

З начнога клуба на тэлебачанне

— Паралельна з КВЗ я працаваў у начных клубах горада. Напрыклад, у «Стоплайне» з'явіўся скандальны праект «Шоу-балет у раёне пахвіны». Я ў пары са сваім сябрам Рустамам Дранікавым, які ўжо тады працаваў на радыё, гуляў у КВЗ. У нас заставалася шмат матэрыялу, пра які можна сказаць, што гэта так званы чорны гумар. Са сцэны такое на прачытаеш, а вось у начных клубах усе гэтыя жарты на грані фолу ішлі на ўра.

Яшчэ я працаваў у «Флінце». Менавіта там мая калега Юлія Шэрамецьева заўважыла мяне і неяк патэлефанавала і

КРЫМІНАЛ

УКРАЛІ — І Ў КАЗІНО

Як паведаміла прэс-служба МУС Гродзенскага аблвыканкама, аператыўнікамі крымінальнага вышуку пры садзейнічанні Мастоўскага райаддзела міліцыі раскрыты шэраг кватэрных крадзяжоў.

На ліку падазроных, а гэта асобы цыганскай нацыянальнасці 1979 і 1990 гадоў нараджэння, болей за дзясятак злачынстваў. Акрамя таго, зараз праводзіцца праца над устанаўленнем дадатковых эпізодаў іх супрацьпраўных дзеянняў.

Супрацоўнікам Мастоўскага РАУС удалося выйсці на след аднаго з падазроных пасля крадзяжу. Малады чалавек неўзабаве быў затрыманы, а за ім — і яго паплечнік па злачынстве.

Схема злачынстваў была простая. Ва ўсіх выпадках яны заходзілі ў дом ці кватэру з мэтай зняцця жылля. Улучалі момант, каб адшукаць месца, дзе могуць быць схаваны грошы.

У аператыўнікаў склалася ўражанне, што маладыя людзі інтуітыўна адчувалі месцы схованкі. У адным эпізодзе малады чалавек скраў у пенсіянеркі 20 тысяч даляраў. Іх кабеце перадала на захаванне ўнучка пасля продажу кватэры.

Пасля чарговай вылазкі падазраваныя ехалі ў сталіцу і трацілі скрадзеныя грошы ў казіно і іншых забаўляльных установах.



ІЛЮСТРАЦЫЙНАЕ ФОТА

Крадуць

наш край

…АКРАМЯ ПАЕЗДКІ Ў ДЫСНЕЙЛЕНД»

спытала, ці не хоча Дзіма весці моладзевую праграму «Фрэш» на гродзенскім тэлебачанні. А Дзіма кажа — вядома! На той момант гэта была мая блакітная мара — працаваць на тэлебачанні.

— Ці было цяжка спачатку?

— Мне здаецца, я хутка і лёгка ўвайшоў у тэлевізійнае жыццё. Было гэта ў 2012 годзе. Спачатку праграма «Фрэш», потым «Малаток». На той момант у маім жыцці яшчэ заставалася праца ў начных клубах, але потым неяк надакучыла.

Радыё — экстрым без права на памылку

— Як ты трапіў на радыё?

— Асаблівай гісторыі тут няма. Я проста папрасіў паспрабавацца ў якасці вядучага. Спачатку быў лінейны эфір — гэта калі проста кажаш у перабіўках паміж песнямі прагноз надвор`я ці тое, якая будзе наступная кампазіцыя. А потым з`явілася свая праграма.

Радыё — гэта экстрым. Гэта прамы эфір, калі ты не маеш права на памылку. Але і яны здараюцца. Я мільёны раз загаворваўся. У мяне былі такія моманты, калі спачатку ішла адна думка, потым неяк успывала другая. Іх трэба было неяк лагічна звязаць. Калі гэта атрымліваецца — ты потым думаеш: «Ох, як гэта было крута!» Выдыхаеш і працуеш далей.

«Адчуваю сябе шчаслівым чалавекам»

— Табе не надакучыла гэтая бясконцая балбатня на радыё?

— Не! Я адчуваю сябе ў сваёй талерцы і разумею, што 17-гадовы хлопец Дзмітрый Чэкан, які марыў працаваць у міліцыі, ён, мусіць, хацеў нейкай рамантыкі, якую яшчэ не зведаў. Цяпер я адчуваю сябе шчаслівым чалавекам, таму што рэальна ведаю: тое, што я раблю, гэта карысна.

— Каму?

— Ну вось уяві: ты працуеш у офісе якім-небудзь менеджарам. Кожны дзень адно і тое ж. Табе абрыдла ўся гэтая руціна, а дома дзеці, муж, камп`ютар... вось у такой паслядоўнасці... Ты не ўяўляеш, але вельмі шмат людзей жывуць менавіта так. Яны прыходзяць дадому ці на працу і ўключаюць радыё, а там чувакі... добрыя хлопцы весела і жыццярадасна расказваюць розныя цікавыя гісторыі, смяюцца, праводзяць лёгкія гульні і такім чынам прымушаюць чалавека адпачыць і абстрагавацца ад штодзённых праблем.

— Чаму менавіта «Барадатае шоу»?

— А па мне не бачна? — смяецца Дзмітрый. — Першае, што зрабіў, калі звольніўся з МНС, выкінуў брытву. Пастаяннае галенне мяне вельмі стамляла. А назву мне падказаў Рустам. У інтэрнэце ёсць відэаверсія шоу — у хуткім часе гэты праект ператворыцца ў тэлевізійны.

Галоўная гусь горада

— У сацыяльнай сетцы «ВКонтакте» ёсць суполка «Гуси Гродно», і там цябе называюць галоўнай гуссю. Як ты стаўшся да такой папулярнасці?

— Што за група, я паняцця не маю. Мне сказалі, што мяне там абмяркоўваюць, я зайшоў паглядзець. І нават атрымаў ад прагляду каментарыяў задавальненне. Я не пакутую ад таго, што некаторыя людзі могуць мяне не любіць. Гэта нават добра. Было б дрэнна, калі б усе казалі — так, чувак, ты робіш усё добра. Раз мяне абмяркоўваюць, то значыць, я раблю ўсё правільна. Дрэнна было б, калі б мяне ў маёй прафесіі не абмяркоўвалі.

— Вельмі шмат інтэрнэт-карыстальнікаў лаюць цябе за твае вулічныя апытанні. Маўляў, людзі прадстаўлены не ў лепшым святле?

— Але ж нехта кажа, што гэта класна і выдатна. Вось я на баку гэтых людзей. Што тычыцца вулічных апытанняў — то гэта вельмі крутая тэма. Да таго ж смешная. Зноў-такі, яна разгружае. Глядзіш — усміхаешся і цешышся з таго, што хтосьці затупіў на вуліцы. Аднак я ні ў якім выпадку не хачу абражаць гэтых людзей або казаць, што яны нейкія дурні. Наадварот. Нават заклікаю ўсіх тых, хто такое кажа, паспрабаваць пастаяць перад камерай для пачатку. Бо гэта складана, калі ты ідзеш па сваіх справах, а да цябе нейкі барадаты мужык падыходзіць з дзіўнымі пытаннямі. Вядома, ты ў першыя хвіліны губляешся і не ведаеш, што сказаць. І гэта натуральна. Гэтым людзям можна і трэба сказаць дзякуй, таму што яны вельмі разумныя і адукаваныя. Менавіта такім людзям уласцівая самаіронія, і яны могуць пасмяяцца з сябе.

Паехаць у Дыснейленд і зняцца ў кіно

— Ці ты думаеш пра тое, што табе гэта ўсё надакучыць і ты пачнеш нечым іншым займацца?

— Цалкам магчыма.

— Плануеш нейкія сур`ёзныя праекты?

— І планую, і раблю. У мяне ёсць вельмі добры праект. Ён называецца Jazz&blues, у яго я ўкладваю шмат сіл. Мне вельмі радасна назіраць, як запіс распаўсюджваецца ў інтэрнэце. Неяк я паглядзеў, адкуль тыя людзі, што слухаюць яе. Самы заходні каментар быў з Рыгі, а ўсходні — з горада Каёма, гэта ў Японіі

— Чаму ты робіш гэты праект?

— Бо гэта мая ўлюбёная музыка.

— Твой асабісты топ-5 блюзавых і джазавых музыкаў?

— Бі Бі Кінг — яго ігра на гітары мяне заварожвае, Джэніс Джоплін, хоць не падтрымліваю яе лад жыцця, Рэй Чарльз, Эрык Клэптан, Ніна Сімон.

— Пра што ты марыш і што б хацеў зрабіць у гэтым жыцці?

— Неяк так атрымалася, што ўсё, што я хацеў, збылося. А не! Я ж не быў у Дыснейлендзе! Мне было шэсць гадоў, калі па тэлевізары паказвалі мульцік «Качыныя гісторыі» і паміж серыямі былі перабіўкі з Дыснейленда. Усё. З таго моманту — гэта мая мара. А яшчэ хачу зняцца ў нейкім жудасна касавым кіно. Напрыклад, з Робертам Даўні-малодшым, — смяецца Дзмітрый. — Я свята веру ў тое, што людзі, якія займаюцца журналістыкай, дыджэі на радыё, вядучыя, павінны хацець стаць вядомымі і знакамітымі, а калі яны гэтага не хочуць, значыцца, іх кар`ера вельмі дрэнна развіваецца.

— Калі б з радыё і тэлебачаннем у цябе не склалася, то кім бы ты стаў?

— Напэўна, псіхолагам. З маіх прыёмаў людзі сыходзілі б вясёлыя і шчаслівыя.

t-styl.info

НАВІНЫ

НА МАСТОЎСКІМ БАЗАРЫ НЯМА БАЗАРУ



Гандлёвыя палаткі 15 лістапада. Працавала толькі восем



Тут раней мастаўляне прадавалі ўраджай са сваіх агародаў

Мастоўскі базар, дзе яшчэ год таму было не прайсці між палатак і наведвальнікаў, асабліва ў выхадныя дні, зараз пустуе.

Напачатку рынак у Мастах знаходзіўся на вуліцы Пясочнай, амаль у цэнтры горада. Пасля некалькіх спробаў уладам у 2000 годзе ўдалося перамясціць прадпрымальнікаў на ўскраек горада, на тэрыторыю былога калгаснага рынка.

У выходныя дні тут размяшчалася больш за сто палатак, працаваў крыты павільён, дзе прадаваліся мясныя прадукты.

На пачатку гэтага года раённыя ўлады палічылі, што прадпрымальнікам гандляваць шэсць дзён на тыдзень занадта, і рашылі, што ІП павінны працаваць толькі ў пятніцу, суботу і нядзелю. З часам тут станавілася ўсё менш і менш прадаўцоў і, адпаведна, пакупнікоў. Як засведчыла адна прадпрымальніца: «Мастоўскаму базару — капут».

КУЛЬТУРА



Раман КАРПЕНКА
Уласны карэспандэнт
«ГС» па Зэльвенскім раёне
roma.karpenko.2014@yandex.ru
Тэл: +3751564 3-33-83

Зэльва — наш край

ЗЕЛЬВЕНСКИЙ «СВЕТОЧ» ПРОЛОЖИЛ ПУТЬ В ПРОШЛОЕ

ИЛИ РАЗГОВОР О ТОМ, КАК РЕПОРТЕР «ГС» ЗАГЛЯНУЛ В ЗАМОЧНУЮ СКВАЖИНУ ГРОЗНОГО ЛАВРЕНТИЯ БЕРИЯ

Ощутить запах мужского одеколона 1915 года, изобразить «чертика» ручкой 50-х, заглянуть в замочную скважину Лаврентия Берия (и при этом не получить в затылок пулю от НКВД) — эти уникальные возможности предоставляет только один музей Беларуси. Крохотный «Светоч» в Зельве, которому недавно присвоили высокое звание — народный.

Войти в любой музей мира — все равно что сесть в кабину машины времени, над изобретением которой веками бьются физики, но которую уже давно создали археологи, кладоискатели, да и просто грибники с охотниками, наткнувшиеся в лесу на гнилую саблю и мятый капалин.

«Светоч», размещенный в стенах средней школы №3, невзирая на свои скромные размеры (60 кв. м), предлагает путешествия сразу в несколько периодов прошлого: неолит, девятнадцатое и двадцатое столетия нашей эры. В газетах пишут, что музей сформировался в 2003 году, однако все началось с тех пор, как река Щара объявила о своем отступлении в районе деревни Баруки, а было это еще в 60-х. Мельчая, река оставляла на песке не только старые рыбацкие сети, но и совершенно необычные предметы, которые тут же изымались местными детьми. Деревенские «баркильфедро» носили свои находки Марии Захарчук, а Мария Александровна как раз преподавала историю в школе деревни Острово и без особого труда распознавала их уникальность: «О! Да это же кость мамонта, дети. А это — орудие войны и труда первобытного человека». Тогда-то и возникла идея создания музейного уголка прямо в сельской школе.

Впоследствии большая часть коллекции досталась дочери Марии Захарчук — Лилии Сидорко, которая унаследовала не только ценные экспонаты, но и профессию матери — стала преподавателем истории в школе райцентра. Сидорко проявила в фамильном деле невероятный энтузиазм и целеустремленность. Островская коллекция в Зельве утвердилась. Благодаря археологам, юным искателям, учителям, администрации школы, да и простым обывателям, которым небезразлична история родного края, музей быстро пополнился новыми раритетами, расширил свою площадь, улучшил условия хранения, завоевал большое количество наград в конкурсах среди музеев и теперь вызывает интерес не только у жителей района, но и у зарубежных гостей.

Экскурсоводами выступают школьники. Сейчас это пусть и не очень великий, но весьма содержательный сборник таких экспозиций, как природоведческие «Каменные чудеса», «Анненский кирмаш», посвященный возрождению легендарной ярмарки, «Белорусская хатка», отражающая сельский быт в конце XIX века. «Зельвенщина в 20-30-е годы XX века» с раритетными книгами, фотографиями и агитплакатами, «Великая Отечественная война» с наградами, фронтовыми письмами и партизанским оружием, «Образование Зельвенщины» и «История школы» с классом, попадая в который ощущаешь себя школьником советской эпохи, и доской, на которой ты можешь отыскать фото своего отца в пиджаке октябренка.



Хранительница музея Лилия Сидорко

— У нас хорошая коллекция старинных печатных машинок, радиол, граммофонов, — говорит Лилия Борисовна, — есть старый телевизор, на днях подарили кинопроектор «Украина» 60-х годов. В будущем все эти приборы составят отдельную экспозицию «Технические средства обучения». Для этого школа выделила еще одно помещение — бывшую кинорубку в актовом зале...

Оригинальность музею придают каменные топоры эпохи неолита. Роскошная коллекция старинных утюгов могла бы стать предметом глубоких научных исследований. Указ Александра III. Похвальный лист 1918 года, качество типографии которого не уступает качеству современного «Кавалера». Книга с автографом украинца А. Сильвашко, который после легендарной встречи на Эльбе с Роби Уильямсом работал педагогом в Зельвенском районе. Котелок красноармейца Великой Отечественной с автографом, именами девушек и списком пройденных им фронтов. А также лапти из покрышек полуторки, зажигалка и мужской одеколон солдата Первой мировой войны, до сих пор сохранивший свой аромат, и даже — замочная скважина с дачи Лаврентия Павловича Берия.

—Взгляните, — указывает на стенд Лилия Сидорко, — вот еще любопытные раритеты: кружка «Зингер», саперная лопатка, бляха от ремня и другие личные принадлежности солдата Первой мировой. Эти вещи найдены в этом году на археологических раскопках в деревне Медухово и переданы нам военкомом Е. Шишко. Это, кстати, первые подобные раскопки и находки в нашем районе. На место наткнулся грибник... А вчера музей пополнился простреленной каской бойца Великой Отечественной и старинной соковыжималкой.

В общем, музею есть что показать. 1 200 экспонатов стимулировали такие увлекательные, расширяющие кругозор выставки, как экспозиция старинных ручек, елочных игрушек, история футбола и т.д. На областном слете музеев Беларуси, который состоялся в Лиде, «Светоч» объявили «народным музеем учреждения образования». Музеев много, но не всякий — народный. Это звание надо заслужить. Для «Светоча» оно стало закономерным итогом многолетнего и кропотливого труда.

Основанного на голом энтузиазме.

Фото автора



Вещи времён СССР



Эти боевые гранаты были найдены в зельвенской земле

НАШИ ЗА ГРАНИЦЕЙ

МАРИНА БЕЛОВА:
«В ГЕРМАНИИ ДЕТЕЙ В КОНВЕРТАХ С БАНТАМИ НЕ ВЫПИСЫВАЮТ»



Марина Белова

Продолжение
Начало в №45-46

Наша землячка Марина Белова, которая семь лет живет в Германии, знакомит наших читателей с особенностями жизни в этой стране.

В клиниках палаты для рожениц и новорожденных в основном двухместные. Есть и одноместные — для тех, кто платит дополнительную страховку, и семейные — для всей семьи, когда мамочка хочет, чтобы родные находились всё время рядом, в том числе и ночевали.

Я находилась с сыном в двухместной палате, которая оказалась очень уютной. В ней было всё необходимое — кровати на пульте управления, прикроватный столик-тумбочка, комод для пеленания (в нем имеются памперсы, одежда для новорожденного, салфетки), стул для кормления ребенка, стулья со столом для посетителей, плазменный телевизор и многое другое.

Спят детки в маленькой кроватке на колесиках. На каждой стене есть кнопка вызова персонала на случай, если вам стало плохо.

Абсолютно всё там есть и для личного пользования. На полочках лежат средства личной гигиены, также от клиники. К слову, с собой в клинику нужно взять зубную щетку, одежду и полотенце — и все.

Каждый день все помещения убирает персонал клиники, и в каждой комнате стоят бутылочки с дезинфицирующим веществом.

Удивительно, но с рождением ребенка тут поздравляют все — от главного врача до младшего персонала, кто развозит еду или убирает палаты, и все знают, как звать ребенка и вас.

Наутро после родов в палату пришла тренер и бодрым голосом предложила сходить на курс по гимнастике. Чувствовала я себя, конечно, хорошо, но не настолько, чтобы заниматься. Приглашают сходить и на курсы по грудному вскармливанию, где можно поделиться и своим опытом. Также приходят фотографы и за определенную плату предлагают свои услуги.

Спальный мешок для ребёнка — подарок клиники

В моей клинике (сына я рожала в городской, дочку — в католической) на выбор предлагают четыре вида меню: от классического до вегетарианского. Так что выбираете обед исходя из своих предпочтений. На завтрак можно прийти в столовую и выбрать, что хочется, или попросить персонал принести в постель.

Столовая оформлена в домашнем стиле, чтобы было максимально комфортно. Там есть всё, чем, как правило, завтракают немцы: кофе, разные сорта чая, булочки и хлеб, масло, много видов колбас и сыров, разные виды варенья и джемов, мёд, йогурты, хлопья, овощи. Учитывают и интересы мусульман, всегда спрашивают, едят ли свинину. Кстати, можно позавтракать или поужинать с семьей, стоит это 5 евро.

По опыту моих подруг из Беларуси или России знаю, что многие мамы едят только вареную курицу и гречку, боясь аллергии и того, что ребенка может высыпать. Тут такого нет. Врачи рекомендуют есть все, но без фанатизма, конечно. Это видно из меню.

В столовую можно войти по чипу, который вам выдается. Обед всегда привозят в палату. Он может состоять из супа-пюре из тыквы и моркови, картофеля с овощами и мясом, персикового йогурта и пирожного. Чай и кофе можете пить хоть весь день, ящики с минеральной водой стоят в коридоре.



Столовая в клинике

Ужин такой же, как и завтрак. К слову, готовят очень вкусно, ну по крайней мере для меня — люблю общепит почти одинаково с домашней едой.

Лежат в больнице, если все хорошо, три дня с обычными родами и пять дней — с кесаревым сечением. Перед выпиской выдают U-Heft — карточку с обследованиями ребенка.

Утром ко мне пришла акушерка, подарила подарок от клиники — спальный мешок для ребенка. После трех дней не рекомендуют накрывать ребенка одеялом, а советуют класть именно в такие мешки.

Для того чтобы выписаться, родители должны показать автокресло (без него не выпишут ребенка) и то, как пристегнут ребенок. После просмотра краш-тестов я являюсь сторонником только автокресел. Мне страшно, когда я вижу, как у нас возят в машинах детей без автокресел, держат их на руках или кладут в корзинки от колясок.

Детей здесь не выписывают в конвертах с бантами, а одевают в обычную одежду или в ползунки.

На прощание врачу и медперсоналу мы подарили по коробке конфет и зефира (многие любят русские блюда или сладости), и они были в восторге. Тут нет такого, чтобы дарить цветы или покупать подарки. Относятся медики к этому как к своей работе.

Подготовила
Наталья ИВАНОВА
Фото из архива
Марины БЕЛОВОЙ

ПРОШУ СЛОВА

РАБОТАТЬ НЕ ПРОБОВАЛИ?



Неоднократно наблюдал такую картину: люди в церковь ходят не только для того, чтобы помолиться, но и чтобы получить бесплатно еду и иногда одежду. Приходят не только старики, но и более молодые, хотя вид у них довольно неприглядный.

Однажды одному из мужчин, пришедшему за бесплатным талоном на еду, которые, кстати, дают в Свято-Троицком соборе в Слониме, предложили помочь убрать мусор на территории. Реакция его очень удивила:

—Я сюда не на работу пришёл.

И мужчина стал требовать свой паек, как будто за своим законным чем-то пришёл.

И, что самое удивительное, большинство так прихожан: как попросят служащие храма что-то сделать, так ни одного не сыщешь, а как на халяву, так все тут как тут. И по виду многих, что приходят в церковь, не скажешь, что инвалид или нетрудоспособный.

А некоторые, собрав нужную сумму, позже толпятся за гаражами, держа в руках спиртное. Им уже просто не стыдно просить. Но жизнь на халяву не вечна.

Самое удивительное, что никакие законы о тунеядстве их не пугают. Они будут обвинять кого угодно в том, что у них плохая жизнь.

Хочется спросить у таких бедолаг: а работать не пробовали?

Хотя, конечно, всё зависит от самого человека, а не от системы и правительства. Если ждать, что государство или ещё кто-то иной на блюдечке предоставит работу, да ещё высокооплачиваемую, а за копейки пусть другие работают, тогда действительно, с такими мыслями остается побираться только по помойкам.

Валерий СОЛОДУХО

ЗАГЛЯНЕМ У СЯМЕЙНЫ АЛЬБОМ

КАМСАМОЛЬСКІ ДЭСАНТ У АКУНІНАВА І ПАРТЫЗАНАЎКУ



Побач з ветэранам вайны Міхаілам Аляксандравічам Фідрыкам, падпольшчыкамі, членамі КПЗБ Фёдарам Дарафеевічам Кавалеўскім і Хаімам Янкелевічам Хомскім — М.Емельянчук крайні справа

У пачатку 70-х гадоў XX стагоддзя я працаваў на пасадзе сакратара пярвічнай камсамольскай арганізацыі СПТВ-5. Камітэт камсамола кожны год праводзіў масавыя мерапрыемствы кшталту «Снежнага дэсанту», калі зімой на лыжах з поўнай выкладкай мы ехалі ў вёскі раёна, дзе затым давалі канцэрт і арганізоўвалі вечар адпачынку для моладзі.

А на гэтых здымках адлюстраваны фрагменты ваенна-спартыўнай гульні «Шторм-72». Тады мы ўшанавалі памяць загінуўшых у часы Вялікай Айчыннай вайны ў вёсках Акунінава і Партызанаўка, правялі камсамольскі сход з удзелам ветэранаў, на якім урачыста прымалі ў камсамол моладзь.

Падчас хвіліны маўчання мне пашанцавала быць побач з ветэранам вайны Міхаілам Аляксандравічам Фідрыкам, падпольшчыкамі, членамі КПЗБ Фёдарам Дарафеевічам Кавалеўскім і Хаімам Янкелевічам Хомскім.

З той пары ўжо мінула 43 гады.

Мікалай ЕМЕЛЬЯНЧУК

Фота з архіва аўтара



Прыём у камсамол



Слова далі ветэрану

ПРОСТО АНЕКДОТ



Если Минздрав считает, что увеличение пенсионного возраста повысит продолжительность жизни, то полная отмена пенсий — это шаг к бессмертию.

☺ ☺ ☺

— Я уже заплатил транспортный налог. Почему мне прислали налог еще раз?

— А это уже налог на недвижимость. Ваш автомобиль не все же время ездит. Вот за то, когда стоит и...

☺ ☺ ☺

В Брюсселе русские вандалы осквернили памятник писающему мальчику, написав на нем краской «не ссы, пацан».

☺ ☺ ☺

— Пап, ну почему ты думаешь, что если я была на дне рождения, то курила травку?

— Сынок, я мама...

☺ ☺ ☺

— Семен Маркович, а правду говорят, шо женатые мужчины живут дольше, чем неженатые?

— Таки да, Фима, дольше, мучительно дольше...

☺ ☺ ☺

В одесском ателье:

— Здравствуйте, я хотел бы пошить у вас брюки...

— Таки садитесь и шейте!

Кроссворд Цифровой

Каждой цифре соответствует буква

1	3	4	2	4		2		1						
5		1		6	7	8	1	9	10 →					
11	3	4	12	13		4		3						
4		11		14	4	3	15	13	11					
2	11	4	10	4		8		2						
	9		7		16		10		17		17		18	
17	3	5	2	8	13	18	13	19	13	8	4	8	9	3
	9		4		17		14		3		10		10	
20	15	7	11	9	17	9	18	3	4	19	4	14	13	5
	4		4		13		4		8		8		14	
						6		9		2	4	10	4	8
					15	4	2	2	4	10		13		3
						12		9		4	11	4	1	4
					→ 16	9	11	11	5	21		14		15
						8		4		18	3	4	11	4

ОТ ВЛАДИМИРА ВАШУТЫ

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12	13	14	15	16	17	18	19	20	21

ИЩУ ТЕБЯ

РОДСТВЕННИКИ ИЗ ПОЛЬШИ ИЩУТ В СЛОНИМЕ ВОСКРЕСИНСКИХ

Может быть, у кого-нибудь в Слониме есть информация о кровных родственниках моего отца Александра Воскресинского? Он родился в Слониме в 1904 году.

Если кто-то пожелает поделиться информацией, пишите мне на электронный адрес: jasinska11@gmail.com

P.S. Уважаемые читатели! Если Вы хотите найти кого-то из своих родных, друзей, знакомых, обращайтесь в нашу рубрику «Ищу тебя». Мы поместим Ваше послание на страницах «ГС», сайте издания и в соцсетях. А также обязательно пишите или звоните нам, если Вам что-то известно о людях, которых ищут в нашей рубрике: тел. 8 029 133-04-21, e-mail zhannapleshko@gmail.com

Полина ПЛЕШКО

РЭТРАФОТА



Слонім, Панасоўка, 1930 год

Старонку падрыхтавала Наталля ІВАНОВА

ЗНАЙ НАШИХ

СЛОНИМСКИЕ АРТИСТЫ СТАЛИ ПОБЕДИТЕЛЯМИ МЕЖДУНАРОДНОГО КОНКУРСА

Юные артисты из СШ №8 стали победителями в конкурсе талантливых детей «Усміхніся, Зорачка-2015!» /«Smiling Star-2015!», который проходил в рамках Международного культурного проекта «ZOLAK собирает друзей».

Павел Лащевский (учитель по вокалу Марина Володкович), исполнив свою любимую песню «Влюбленный солдат», в номинации среди 29 конкурсантов стал лучшим и завоевал первое место. По словам Павла, он очень волновался, так как в конкурсе участвовало много сильных ребят.

Стоит отметить, что, кроме занятия музыкой, Паша любит играть в футбол, рыбачить. К тому же, как отметили учителя, он ещё и отличник.



Павел Лащевский



Вероника Леждей



Алина Жилинская, Ксюша Васильева, Алеся Адамчик, Таня Григорчик с дипломом и кубком победителя

Не в первый раз занимает призовые места и группа «Беби-шлягер» (руководитель Елена Фомченко). И в этот раз девочки Алеся Адамчик, Таня Григорчик, Алина Жилинская, Ксюша Васильева в своей номинации на международном вокальном конкурсе заняли первое место.

Как отметила преподаватель Елена Фомченко, несмотря на то, что в их номинации было представлено 12 номеров, конкуренция была жёсткая.

Вероника Леждей, также ученица Марины Володкович, исполнив песню «Ты словно белая ночь» в своей номинации заняла второе место.

Татьяна ПЛАХЕКО
Фото автора, а также участников конкурса

ШКОЛА

В СШ №8 ДЕНЬ ЭНЕРГОСБЕРЕЖЕНИЯ ОТМЕТИЛИ ФЛЕШМОБОМ



Ученики СШ №8

11 ноября после последних уроков, когда на улице начинало темнеть, а свет в школе погас, территория восьмой школы засветилась огоньками цвета электрических лампочек. Так учителя с учениками поддержали день энергосбережения.

А все началось с того, что учительница биологии средней школы №8 Наталья Симончик совсем недавно приняла активное участие в норвежском проекте ШПИРЭ (SPARE) и сумела получить сертификат для школы.

По словам Натальи Павловны, получить сертификат было нелегко, так как в проекте участвовало 60 школ Беларуси. Совместно с коллегами, педагогом-организатором и секретарём первичной организации «Содружество» Еленой Борисевич, а также завучем по воспитательной работе Ириной Синяк и другими учителями была подготовлена флешмоб-акция под названием «Сэкономим киловатты для родной школы».

Ученикам школы в ходе акции были показаны мультфильмы, а также проведены три экологических урока по международной программе ШПИРЭ. Выйдя на улицу и организованно взявшись за руки, ученики с учителями выстроились вокруг школы. «Квітней, Беларусь! Квітней, школа!» — кричали ученики.

Наталья Павловна уверена, что подобные акции лучше доходят до сердец детей, ведь каждый из них почувствовал личностный вклад в данное мероприятие.

Евгений ВОЛОДАЩУК
Фото автора и Татьяны ПЛАХЕТКО



Дети, взявшись за руки, выстроились вокруг школы

Флешмоб-акция «Сэкономим киловатты для родной школы»

Страницу подготовила Татьяна ПЛАХЕТКО
tanyaplahetko@gmail.com

Намеснік галоўнага рэдактара
Мікола КАНАНОВІЧ
Журналісты
Уладзімір ШУМЕЛЬ
Яўген ВАЛАДАШЧУК
Таццяна ДЗЕНІСЮК
Алена КАСЦЮК
Стыль-рэдактар
Жанна ПЛЕШКО
Рэдакцыя сайта www.gs.by
Рэдактар
Дзмітрый МІЦКЕВІЧ
Спецыяліст па рэкламе
Наталля ЦАРОВА

Галоўны бухгалтар
Святлана ПРЫМАВА
Бухгалтар
Вольга БУРСЕВІЧ
Аддзел падпіскі і продажу
Аляксей НАВІЦКІ
8-(029) 322-06-42
Вёрстка і дызайн
Віталь ЕМЯЛЬЯНАЎ
Сяргей РЭКУН

Тэлефоны рэдакцыі:
т/факс: **8 (01562) 29-999,**
Тэл. 6-36-58, 6-36-68, 6-36-54, 6-36-44.
МТС: **8-029-584-87-32**
Velcom: **8-029-133-04-21**
Skype — gazslon
(9.00-18.00)
Для карэспандэнцыі:
231799, г. Слонім, вул. Чырвонаармейская, д. 41
e-mail: gs@gs.by, gazslon@gmail.com

Рэкламная служба
Начальнік рэкламнай службы
Ганна ВАЛАДАШЧУК
anna@gs.by
8-(029) 612-26-43
Супрацоўнікі
Наталля СТРУПАВЕЦ
Людміла КАМЯНЕЦКАЯ
Ірына ФРАНОВІЧ
8-(044) 715-90-03
8-(01562) 6-60-56
(9.00–16.00)
т/факс:
8-(01562) 29-000

Прыём аб'яў і падпіска:
г. Слонім, Чырвонаармейская, 73 Б
(будынак АРЗ)
Працуем аўторак — пятніца 9^{00}-17^{00}
субота — нядзеля 9^{00}-15^{00}
выходны — панядзелак
8-(044) 762-48-39

погода на неделю

	утро	день	вечер
СРЕДА, 18 ноября	9°	11°	10°
ЧЕТВЕРГ, 19 ноября	8°	9°	8°
ПЯТНИЦА, 20 ноября	6°	10°	10°
СУББОТА, 21 ноября	7°	7°	4°
ВОСКРЕСЕНЬЕ, 22 ноября	-1°	3°	2°
ПОНЕДЕЛЬНИК, 23 ноября	1°	1°	-4°
ВТОРНИК, 24 ноября	-1°	2°	-2°
СРЕДА, 25 ноября	-1°	2°	-2°

www.meteoprog.by

«Давай познакомимся»



Хотите встретить свою вторую половинку, но у вас это не получается? «ГС» поможет вам найти друг друга.

Девушка-неформал, 24 года, люблю тяжёлую музыку, дождь, животных и готику, ищу парня-неформала, у которого схожие интересы. Тел. 8-029-926-85-14.

Давайте объявление, приносите свои фото с кратким рассказом о себе по адресу: г. Слоним, ул. Красноармейская, 73 Б, тел. для справок 6-60-56, 8-044-762-48-39.

АНЕКДОТЫ

— Ты так похудела! Это новая диета?

— Да, морковь, свекла и картофель.

— А что делала, варила или жарила?

— Копала!

☺ ☺ ☺

Политехнический институт, Владимир Маяковский выступает на диспуте о пролетарском интернационализме:

— Среди русских я чувствую себя русским, среди грузин я чувствую себя грузином, среди евреев — евреем...

Вопрос из зала:

— А среди дураков?

Ответ:

— А среди дураков я впервые.

☺ ☺ ☺

Одесса. На балкон выходит мама и кричит:

— Аркаша! Домой!

Мальчик поднимает голову и кричит в ответ:

— Я замерз?

— Нет! Ты хочешь кушать!

☺ ☺ ☺

Самое страшное не то, что мы теперь взрослые. А то, что взрослые теперь мы.



ВЫЕЗДНАЯ ПОДПИСКА НА I ПОЛУГОДИЕ 2016 ГОДА

27.11.2015 ПЯТНИЦА
10.00-11.00
ДЕРЕВНАЯ
11.15-11.45
НОВОСЕЛКИ
12.00-12.30
ВИШЕВО
12.50-13.30
ВЫСОЦК

4.12.2015 ПЯТНИЦА
10.00-11.00
ДЯТЛОВО
11.30-13.00
КОЗЛОВЩИНА
13.20-13.40
ПАВЛОВО
13.45-14.00
НОВОСЕЛКИ
14.10-14.20
ТАЛЬКОВЩИНА

11.12.2015 ПЯТНИЦА
9.20 -09.50
ОЗГИНОВИЧИ
10.10-10.40
МЕЛЬКАНОВИЧИ
11.00-11.10
ОСТРОВО
11.20-11.30
МИЖЕВИЧИ
11.40-11.50
ПАСИНИЧИ
12.00-12.50
СЕЛЯВИЧИ
13.30-14.00
ОЗЕРНИЦА
14.20-14.40
ЕЛКА

18.12.2015 ПЯТНИЦА
9.20-09.30
ШИЛОВИЧИ
9.50-10.20
ЖИРОВИЧИ
10.40-11.10
ПАРТИЗАНОВКА
11.20-11.40
НОВОДЕВЯТКОВИЧИ
12.00-12.20
СУРИНКА
12.30-12.50
ГЛОВСЕВИЧИ
13.00-13.20
ДЕРЕВЯНЧИЦЫ

24.12.2015 ЧЕТВЕРГ
10.00-10.20
ЗЕЛЬВА
10.30-10.50
ДЕРЕЧИН
11.00-11.20
ГОЛЫНКА
11.40-12.10
КОСТРОВИЧИ
12.20-13.00
СЕНЬКОВЩИНА
13.10-13.30
ВАСИЛЕВИЧИ

Дзякуй за тое, што выбралі "Газету Слонімскую"!

Галоўны рэдактар Віктар Уладзіміравіч Валадашчук, victor@gs.by

ЗАСНАВАЛЬНІК **Віктар Уладзіміравіч ВАЛАДАШЧУК**
Газета друкуецца на беларускай і рускай мовах

Рэгістрацыйнае пасведчанне №64 ад 05.03.2009 года, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Свидетельство о госрегистрации УП "Газета Слонимская" ЮКЛ № 001845, выданное Гродненским областным исполнительным комитетом от 03.04.2003 г.

email: gs@gs.by
gazslon@gmail.com
Юрыдычны адрас: 231800, г.Слонім, вул. Чырвонаармейская, 41
Тыраж 4010 экз.

Падпісныя індэксы:
64042 (індывідуальная)
63818 (ведамасная)
63646 (льготная)
Свабодны кошт

Час падпісання да друку па графіку 17 лістапада 2015 года 16:00.
Аб'ём – шэсць умоўных друкаваных аркушаў.

Надрукавана ў друкарні ГАУПП "Гродзенская друкарня" г.Гродна, вул. Паліграфістаў, 4, індэкс 230025.
Заказ № 6860